# Жіночі студії

УДК 930:342.7-055.2(476.6-21)«16»(093.2)

**Наталля Сліж**

## ГАРАДЗЕНСКАЯ МЯШЧАНКА Ў ПАЛОНЕ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА ПРАВА: ПА МАТЭРЫЯЛАХ МАГІСТРАЦКІХ КНІГ XVII СТ.

*Гісторыя гарадзенскай мяшчанкі ніколі не вывучалася. Таму прадстаўленне гэтага аспекту актуальна для гістарыяграфіі. На сённяшні дзень захавалася даволі абмежаваная колькасць крыніц па гісторыі мяшчанак. Фактычна яны прадстаўляюць сямейную сферу жыцця жанчын. У патрыярхальным мяшчанскім грамадстве дамініруючая роля належала мужчыне і другасная – жанчыне. У гэтым супадалі і заканадаўства, і практыка права. Жанчына мела права атрымаць маёмасць па спадчыне, перадаць яе спадкаемцам, прадаць, купіць. Але ўсе яе маёмасныя аперацыя здзяйсняліся пад кантролем. Мала прадстаўлены іх удзел у рамястве і гандлю. У сістэме кіравання горада жанчыны не маглі ўдзельнічаць.*

***Ключавыя словы:*** гарадзенская мяшчанка, Гародня, практыка права.

Прававому становішчу мяшчанак у перыяд Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) прысвечана не так шмат прац[1]. Гісторыя гарадзенскай мяшчанкі ніколі не вывучалася. Таму прадстаўленне гэтага аспекту актуальна для гістарыяграфіі.

Для гарадоў ВКЛ прававой асновай стала магдэбургскае права, якое было прынята яшчэ ў XIV ст. у Вільні, Берасці. Гэта азначала, што разам прыйшлі два асноўныя зводы законаў – Саксонскае Люстра (*Speculum Saxonum*) і Вейхбільд (Ius municipale). Для сярэднявечча яны былі актуальныя, але для XVI ст. гэта былі ўжо маральна састарэлыя нормы права, не кажучы

[1] У асноўным гэта працы літоўскай даследчыцы Іаланты Карпавічэне па мяшчанках Вільна і Коўна: Jolanta Karpavičienė. "…Magdeburgo teisėje gerada turi dukrai tekti": turtinė moters padėtis Vilniuje ir Kaune XVI a. pirmojoje pusėje // *Lituanistica* 3 (47) (2001) 3–18; Jolanta Karpavičienė. Moters padėtis Kaune XVI a. pirmojoje pusėje: globėjiškas miesto teisės aspektas // *Kauno istorijos metraščio* 3 (2002) 37–47; Jolanta Karpavičienė. *Moteris Vilniuje ir Kaune XVI a. pirmojoje pusėje: gyvenimo sumiestinimo Lietuvoje atodangos*. Vilnius 2005, і інш.

ўжо пра XVII ст. Пры чым састарэлі не толькі асноўныя палажэнні, але і сама падача прававога матэрыялу. Статуты ВКЛ мелі значна лепшую арганізаваную ўнутраную тэматычную структуру, якая значна палягчала працу праўнікам. Нагрувашчаныя артыкулы Саксонскага Люстра (СЛ) і Вейхбільда прымушалі ствараць каментары і дадатковыя выданні (напрыклад, Б. Граіцкага, П. Шчэрбіча, А. Ліпскага). Адаптоўвалі гэтыя зводы законы да рэчаіснасці ВКЛ праз прывілеі, вількеры і іншыя дакументы.

Саксонскае Люстра і Вейхбільд адрозніваліся ад Статутаў у трактаванні статуса жанчыны, яе правоў і абавязкаў. Па-сутнасці жыццё мяшчанкі рэгулявалася сярэднявечным правам, а шляхцянкі – рэнесансным. Практыка права ў гарадзенскім магістраце паказвае, што рэвалюцыйных зменаў у гэтым накірунку не адбывалася.

Паводле заканадаўства жанчына была практычна пазбаўлена самастойнасці. Яна заўсёды знаходзілася ў апецы сям'і, мужа, а пасля яго смерці – апекуноў. Мяшчанка не мела права самастойна распараджацца сваёй маёмасцю без апекуна ці мужа. На судзе яна не магла прадстаўляць свае інтарэсы ці падаваць дакументы (СЛ, ч. 1, арт. 45, 46). Фактычна магдэбургскае права разглядала жанчыну як непаўнаспраўную асобу.

Гарады ВКЛ перанялі феадальнае права, якое цалкам абмяжоўвала жанчыну. Пры чым у гэтым накірунку пры адаптацыі змены адбыліся мінімальныя. Па-першае, сяродураднікаў дамінавалі мужчыны і падобная сітуацыя іх з большасці задавальняла. Ні водны з гарадзенскіх прывілеяў непасрэдна не закранаў правы жанчын. Па-другое, жанчыны былі неадукаваныя, адпаведна не мелі магчымасці непасрэдна азнаёміцца з заканадаўствам, а практыку права ведалі ў той меры, якой яна іх датычылася. Пры гэтым краіна развівалася ў іншым рэчышчы. Шляхцянкі мелі больш шырокія правы, мелі магчымасць самастойна вырашаць маёмасныя пытанні, не знаходзіліся пад жорсткай апекай сям'і і мужа.

Як і польскія мяшчанкі[2], гарадзенскія мяшчанкі не мелі магчымасці займаць пасады. Яны былі практычна выключаны з прававой сістэмы. Жанчыны не сустракаюцца ў якасці сведак у дакументах. Але яны маглі выступаць сведкамі пры разглядзе злачынстваў, ініцыяваць судовую справу[3]. Як правіла гэта мела месца ў справах крымінальнага характару. Такая ж сітуацыя назіралася ў польскіх гарадах[4].

---

[2] Andrzej Karpiński. *Kobieta w mieście polskim w drugiej połowie XVI i w XVII wieku.* Warszawa 1995, c. 2224.

[3] Наталля Сліж. Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст. // *Arche. Гарадзенскі міленіум* 11 (2014) 146, 152, 153, 157; Наталля Сліж. *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ у XVI–XVII стст.* Смаленск 2015, с. 98–99, 543–544.

[4] Andrzej Karpiński. *Kobieta w mieście polskim*, c. 25.

Для прадстаўленне сваіх інтарэсаў у судзе і для разумення тагачаснага парадку афармлення юрыдычных дакументаў патрэбна была адукацыя. Гарадзенскія мяшчанкі ў сваёй большасці былі не адукаваныя. Адукацыя каштавала дорага, яе не маглі дазволіць нават для сыноў. У прыватна-прававых дакументах, дзе быў патрэбны подпіс, часта падпісваліся ўраднікі. Намі быў выяўлены толькі адзін дакумент з подпісам мяшчанкі Кацярыны Дахновічаўны за 1655 г.[5] Рэпрэзентатыўнасць дакументаў не дазваляе сцвярджаць, што толькі адна мяшчанка ў Гародні была адукавана. Кацярына была адзінай дачкой і бацькі маглі аддаць яе ў школу ці наняць настаўніка. Аднак для мяшчанскай сям'і быў сэнс адукоўваць сыноў, бо толькі асобы мужчынскага полу маглі займаць пасады ў магістраце, займацца афіцыйна рамяством.

Па магдэбургскім праве жанчыны не маглі самі прадаць сваю ўласнасць. Яны павінны былі атрымаць згоду мужа, а калі ён памёр, то апекуноў, таксама продаж узгадняўся з дзецьмі. У акце продажу Ян Краеўскі фігураваў як старшы ў шлюбе. Ён разам з жонкай Аўдоццяй Ілкевічоўнай прадаў палову пляца на вул. Віленская Яну Савіцкаму (1642)[6]. Рэгіна Ілкевічоўна, удава радцы Станіслава Мерэеўскага, аформіла продаж жыдам Кадышу Александровічу і яго жонцы Песі Маркоўне з апекуном Табіяшам Дорбахам, сендыкам, і зяцем Янам Смяроўскім (1642)[7].

У выпадку канфліктаў часта муж прадстаўляў інтарэсы жонкі. Крысціна Адамавічаўна Грыбунянка абвінавачвалася лаўнікам Мацеем Ябланоўскім ў невяртанні пазыкі (21 злоты) і двух бочак жыта памерламу цесцю Ябланоўскага – Яну Катоўскаму. Муж Петр Зубрыцкі ад яе імя сведчыў аб невінаватасці і патрабаваў запіс аб пазыцы ў Ябланоўскага (1639)[8].

Мяшчанкі не ўваходзілі ў склад цэхавых структур. Статуты гарадзенскіх цэхаў, як і статуты іншых гарадоў ВКЛ, дазвалялі мужчынам быць цэхмайстрамі, вучнямі, таварышамі. Жанчыны ў дакументах фігуруюць як удовы. Яны маглі былі ўключаны ў рамяство ў асноўным праз сям'ю. Адсутнасць адукацыі і гістарычныя ўмовы пазбаўлялі мяшчанку актыўна ўдзельнічаць у сістэме кіравання горада і яго эканамічным жыцці. У дакументах вельмі рэдка сустракаюцца выпадкі ўдзелу жанчын у рамястве і гандлю. Так, пры разглядзе канфлікту ў кравецкім цэху высветлілася, што замест краўца Яраша Ушакоўскага рамяством займаецца яго жонка: "...zona

---

[5] Матэрыялы гродзенскага дамініканскага манастыра, 1647–1667 гг. // Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas (LVIA), f. 694, ap. 1, b. 4624, l. 4–5.

[6] Актавая кніга гродзенскага магістрата 1638–1644 гг. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 241 адв. – 242 адв.

[7] Тамсама, арк. 8283 адв.

[8] Тамсама, арк. 126–126 адв.

iego powiedziała, ze moy mąz rzemesła nie robi ia sama robię a mąz tylko skraie robotę…” (1639)[9]. У мытных кнігах згадваецца, што мыла вывазіла ў Каралявец мяшчанка Давыдава Ныклёва (1605)[10]. Гэтыя фрагментарныя звесткі практычна не даюць магчымасці прадставіць прафесіі, дзе былі задзейнічаны жанчыны. Архівы гарадзенскіх цэхаў да нашых дзён не дайшлі. Адпаведна дакладна не можам прааналізаваць рамеснікаў горада.

Асноўнай сферай дзейнасці мяшчанкі была сям'я і гаспадарка. Яе прадстаўляюць даравальныя запісы, тэстаменты, акты куплі-продажу, інвентары і інш. Але дакументы дазваляюць толькі ў некаторай ступені асвятліць жыццё мяшчанкі, бо сямейныя архівы не захаваліся.

Звернем увагу на такі аспект як адносіны з мужам. Пасля шлюбу ў дакументах муж і жонка звычайна выступалі разам. Напрыклад, яны разам пакупалі ці прадавалі маёмасць[11]. Сумесна афармлялі пазыковыя запісы. Напрыклад, Мікалай Станіслававіч Ляховіч і жонка Гальшка Кроснеўшчанка пазычылі 300 злотых у жыда Якубовіча і яго жонкі Бэлі Якубоўны пад заставу пляца на вул. Вялікай Маставой (1639)[12].

Адносіны паміж мужам і жонкай складваліся па-рознаму. Добрыя стасункі пацвярджаліся дараваннем маёмасці. Сустракаліся выпадкі ўзаемнага даравання маёмасці. Перад войтаўска-лаўніцкім судом мяшчане Ян Тарасовіч і Агнешка Мацееўна публічна вызналі праз шляхціча Якуба Клюкоўскага, што рухомая і нерухомая маёмасць Яна ў выпадку смерці пераходзіць жонцы, тое ж прадугледжвалася ў выпадку яе смерці (1588)[13]. Па той жа прычыне Крысціна Вербікоўна і Андрэй Філіповіч сведчылі перад смерцю перад гарадзенскім намеснікам Андрэем Грушчынскім пра запіс адно другому сваёй маёмасці (1657)[14]. Такія выпадкі мелі месца ў бяздзетных сем'ях.

Адмысловыя даравальныя запісы сустракаюцца рэдка, часцей запісы на карысць жонак змешчаны ў тэстаментах. Калі ў сям'і не было дзяцей, то асноўная маёмасць пакідалася жонцы. Радца Марцін Фандэберг зрабіў запіс жонцы Еве Цвіклянцы на рухомую і нерухомую маёмасць у 1624 г., а пасля

[9] Актавая кніга гродзенскага магістрата 1638–1644 гг. // НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 20.

[10] Мытная кніга гродзенскай каморы, 1605–1606 гг. // Vilnau Universiteto Bibliotekos Rankraščių skyrius, f. 4-A372, l. 30.

[11] НГАБ, ф. 1761, спр. 1, арк. 99 адв. – 101 і інш.

[12] Тамсама, арк. 14–15.

[13] Маёмаснае пагадненне паміж сужэнцамі Тарасовічамі, 1588 г. // LVIA, f. 1282, ap. 1, b. 11218.

[14] Актавая кніга войтаўска-лаўніцкага суда, 1659–1676 гг. // НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25 адв. – 26.

пацвердзіў гэта ў сваім тэстаменце (1642)[15]. Мікалай Ляховіч запісаў палову дома жонцы Альжбеце Кроснеўчанцы, а палову – гарадзенскаму бернардынскаму касцёлу (1640)[16]. Лаўнік Тамаш Янчэўскі ўсю маёмасць запісаў жонцы Ядвізе Наленчоўне (1643)[17]. Калі сваякі адмовіліся дапамагчы, то жонка Ева Прушкоўская выкупіла з няволі мужа Яна Лукашэвіча Януцевіча, катляра. За гэта ён запісаў усю сваю маёмасць. Дзеці іх памерлі малымі, таму яна была яго адзінай спадчынніцай (1644)[18]. Лаўнік Казімір Петраншэвіч (Петрансевіч) за ўнясенне у суме 85 злотых, добрае стаўленне ў здароўі і пры хваробе запісаў навечна дом з агародам, з валокамі каля Гарадніцы, рухомыя рэчы і свойскую жывёлу жонцы Магдалене Зялінскай (1649). Браты маглі атрымаць ад яе айчыстую маёмасць пры ўмовы выплаты 85 злотых[19]. Рэзнік Войцех Барысовіч валоку ў Альшанцы падзяліў паміж рэзніцкім цэхам і жонкай, але пасля смерці яе палова пераходзіла цэху (1664)[20].

Магдалена Цвіклянка стала асноўнай спадчынніцай мужа Юрыя Стрэчня. Яна атрымала 3,5 валокі ў Адамовічах з будынкамі, вуллямі, свойскай жывёлай. Запісаў гэту маёмасць навечна, бо яна ўнесла пасаг 1000 злотых (1664)[21]. Юрый Шэльпук у тэстаменце падарыў жонцы Марыяне Карлоўскай домік, які знаходзіўся на пляцы Ганны Гаўронскай, жонкі Міхаіла Хэйварта. Пры ўмове, што калі брат не выкупіць застаўную палову валокі ў Адамавічах, то яна таксама пераходзіла жонцы. Марыяне засталася практычна ўся маёмасць, за выключэннем 20 злотых для сястры Марусі (1667)[22]. Згодна з тэстаментам Пятра Цібароўскага ўся рухомая маёмасць (жывёла, збожжа і інш.) прызначалася жонцы. Ён прыйшоў жыць у яе дом, а нажытыя разам рэчы пакідаў жанчыне (1669)[23].

Дагляд падчас хваробы быў сур'ёзнай прычынай для дарэння маёмасці ў тэстаменце. Дарота Шашкоўна атрымала ад мужа Лявона Зыскевіча, палову валокі з пасевамі, пляц з домам у горадзе і два пляцы, грошы з якіх прызначаліся лячэнне ці пахаванне, у залежнасці ад сітуацыі (1671)[24].

---

15 НГАБ, ф. 1761, спр. 1, арк. 239 адв.; Наталля Сліж. Купцы Фандэберкі ў Гародні ў XVII ст. // *Архіварыус* 14 (2016) 347–357.

16 НГАБ, ф. 1761, спр. 1, арк. 163 адв. – 164, 168 адв. – 169.

17 Тамсама, арк. 243–243 адв.

18 Тамсама, арк. 293 адв. – 294.

19 Klasztor franciszkanów // Archiwum Głównym Akt Dawnych (AGAD), Zbór Józefa Jodkowskiego, sygn. 7, k. 3–10.

20 НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 218 адв. – 219.

21 Тамсама, арк. 91 адв. – 92 адв.

22 Тамсама, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 146; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 150–150 адв.

23 Тамсама, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 189.

24 Тамсама, арк. 219 адв. – 220.

Сымон Гурыновіч запісаў жонцы Еве Альшанскай усю маёмасць – палову валокі, дом на шпітальным пляцы, свойскую жывёлу (1675)[25].

Па дакументах назіраецца, што для мяшчан важнае значэнне мела сям'я, якую яны стварылі самі. Калі маёмасць нажылі разам з жонкай, то зразумела, што яна станавілася спадчынніцай. Пры гэтым істотнымі былі адносіны, якія склаліся падчас сумеснага пражывання. У бяздзетнай шляхецкай сям'і нерухомасць пераходзіла сваякам, бо яна павінна была застацца ў родзе. Для мяшчанскай сям'і родавая гісторыя не адыгрывала такой важнай ролі, як для шляхецкай. Больш цаніліся тыя, хто побач.

Але былі выпадкі іншага размеркавання маёмасці ў бяздзетных сем'ях. Маёмасны стан дазволіў Барталамею Галоўчыцу вылучыць жонцы Рэгіне Махнянцы толькі 4 кавалкі сала. Усю сваю нешматлікую рухомасць ён размеркаваў паміж сваякамі (1639)[26]. Стэфан Максімавіч Гібула асноўным спадкаемцам зрабіў сваяка бурмістра Стэфана Себасцянавіча Гібулу. Жонцы Кацярыне Хвёдараўне Шэшкуцёўне вылучыў 8 коп літоўскіх грошаў з маёмасці ў Гібулічах і хатнія рэчы (1639)[27].

Пры наяўнасці дзяцей спадчына размяркоўвалася з улікам інтарэсаў нашчадкаў. Але ўмовы атрымання маёмасці залежалі ад колькасці дзяцей, стасункаў з жонкай, стану заможнасці. У радцы Фёдара Багдановіча з трэцяй жонкай Марынай Кішмановічаўнай склаліся добрыя стасункі. Ён атрымліваў ад яе дапамогу пры хваробе. Ад мужа Марыне быў запісаны дом пры Прачысценскай царкве. Як добрую гаспадыню муж пакінуў яе кіраваць усёй маёмасцю да таго часу, пакуль яна не пойдзе замуж і да выплаты дзецьмі грошай. У трыманні Марыны былі дом ў Манчыне з трыма валокамі (спадчына ад маці); там жа валока набытая Багдановічам Кахоўская; грунт з засеяным шанкам пшаніцы; 1,5 валокі, якія заставіў радцы мешчанін Ян Вінаградскі ў 40 коп літоўскіх грошаў; палова валокі ў Грандзічах. Дочкі заставаліся пры маці пакуль не выйдуць замуж. На ўсіх дзяцей прыходзіўся пляц на вуліцы Калючынскай (1640)[28].

---

25 НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр 2, арк. 409.

26 Тамсама, спр. 1, арк. 108 адв.; Антон Грыб, Зміцер Яцкевіч. Тэстамент гарадзенскага мешчаніна Барталамея Галоўчыца 1639 г. як крыніцы па гісторыі беларускага мяшчанства // *Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.)* / рэд. Аляксандра Смаленчук, Наталля Сліж. Гародня – Беласток 2008, с. 214–220.

27 НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 108.

28 Тамсама, спр. 1, арк. 150–155; Наталля Сліж. Тастамент гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча // *Архіварыус* 12 (2014) 65–85.

Нерухомую і рухомую маёмасць, грошы лаўнік Юрый Быхнер падзяліў паміж другой жонкай і дачкой Магдаленай (1643)[29]. Ткач Каспер Багданкевіч перадаў сваіх дзяцей у апеку жонцы (дачка Андрэя Дмухоўскага) і ёй запісаў усю сваю маёмасць, маці вылучыў 10 злотых (1644)[30]. Гэта даволі рэдкі выпадак, калі жонка была прызначана апекункай. Звычайна гэты абавязак перакладаўся на сваякоў, сяброў, ураднікаў. У Польшчы гэта было больш распаўсюджанай з'явай[31].

Бурмістр Ян Адамовіч пакінуў усе валокі, якія меў у Адамовічах жонцы Ягнешцы Весенеўскай за каханне ў шлюбе. Дзеці таксама атрымалі нерухомасць: Агата, Стэфан, Станіслаў, Ядвіга, Дарота, Ганна – па палове валокі, старэйшы Тамаш – 1,5 валокі (атрымаў раней), Кацярына – валоку (палова валокі пры шлюбе і палова па тэстаменту). Дачцэ Зафіі усё было выдадзена яшчэ пры выхадзе замуж. Дачцэ Клары, якую ўзяў на выхаванне швагер Бернат Весенеўскі, ён жа і абяцаў выдаць замуж і даць пасаг (1666)[32].

У тэстаментах агаворвалі ўмовы карыстання маёмасцю. Сужэнцы маглі пакінуць жонку жыць у доме да смерці пры далейшым яго пераходзе дзецям. Урбан Каменскі прызначыў за жонкай Марынай Рашкоўнай права пажыццёвага пражывання ў доме на вул. Рэзніцкай, а пасля яе смерці ён ішоў на палову паміж яго сынам Янам Каменскім і сынам жонкі Пятром Сільвестравічам (1640). Пры гэтым Урбан адзначыў, што не мае дачыненне да ўласнасці жонкі – зямлі, набытай у жонкі радцы Яна Калачкоўскага, дому ў тылу Рынку, на вуліцы як ісці да Прачысценскай царквы[33]. Стэфан Міговец пакінуў жонку Паланею Валянцінаўну да канца яе жыцця ў доме на Падольнай каля Нёмана, а пасля яе смерці дом пераходзіў чацвярым дзецям Адаму, Пракопу, Мікалаю і Аўдоцці (1640)[34]. Пётр Ляўковіч, бурмістр, размеркаваў маёмасць паміж маці Малгажатай, жонкай Даротай Пастэўчанкай і дзецьмі. Маці атрымала палову валокі пад Гародняй, якую яму запісала раней. Пасля яе смерці яна дзялілася паміж сынамі Станіславам і Андрэем. Ёй жа пажыццёва прызначаўся дом і агарод на вул. Рэзніцкай, а пасля пераходзіў сынам. Другую палову валокі трымала жонка да паўналецця дачок Марыяны і Барбары. Новы пабудаваны дом з пляцам на Віленскай пераходзіў жонцы, бо яна пасля

[29] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 266–267.

[30] Тамсама, арк. 284 адв.

[31] Andrzej Karpiński. *Kobieta w mieście polskim*, c. 24–25.

[32] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 125–126.

[33] Тамсама, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 161–162 адв.

[34] Тамсама, арк. 140–141 адв.

пажару ад маскоўскага войска яго за свой кошт аднавіла. Пасля яе смерці дом пераходзіў на дзяцей (1661)[35].

Варта адзначыць, што дочкі не адсоўваліся ад валодання нерухомай маёмасцю. Яны разам з сынамі атрымлівалі сваю частку спадчыны. Пры чым часткі хлопцаў і дзяўчат былі роўныя. Кравец Тамаш Цупрыкоўскі не размяркоўваў асобна маёмасць, а запісаў жонцы Марыне Бакаўне, дзецям Кацярыне, Ядвізе, Зафеі, Антонію, Марце і Ганне дом на вул. Плябанскай на касцельным пляцы (1666)[36].

Калі ў сям'і былі толькі дзяўчынкі, яны атрымлівалі спадчыну. Пасля смерці лентвойта і злотніка Казіміра Цвікліча заставалася жонка Марыяна Паўльсенаўна і дачка Ганна. Жонка за паслугі і добрае стаўленне атрымала магчымасць на пажыццёвае пражыванне ў мураванай камяніцы на рагу Рынку і палову валокі ў Альшанцы. Да таго, ёй прызначалася шмат каштоўнасцяў і рухомых рэчаў. Дачка стала адзінай спадкаемніцай і атрымлівала дом пасля смерці маці і шматлікія рэчы. Паміж імі дзяліўся на палову агарод на Калючынскай і пляц за Нёманам на вул. Нізкая, агарод за Нёманам, валокі ў Грандзічах, пляц каля Рынку – дачцэ (1671)[37].

Маёмасць у тэстаменце не запісвалі дочкам, якія ўжо былі выдадзены замуж і атрымалі свае часткі. Якуб Гукнейка дом з паловай пляца на вул. Віленскай пакінуў жонцы Кацярыне Пушкоўне пажыццёва, а пасля яе смерці – дочкам Марыне і Крысціне. Дзве замужнія дочкі (Кацярына, жонка Аляксандра Карповіча, і Барбара, жонка столяра Грыгора Чэховіча) і пасербіца (Цэцылія, жонка Казіміра Вінаградскага) былі замужам і таму маёмасць ужо атрымалі (1672)[38].

У некаторых выпадках жанчына заставалася без нерухомасці. Агаф'я Цімохава захавала пры сабе толькі рухомыя рэчы, якія ўнесла ў дом мужа Марціна Сцерніка, а дом ён падзяліў паміж трыма дзецьмі ад першага і трыма ад другога шлюбу (1642)[39].

Жанчыны не заўсёды былі задаволены тэстаментам мужа. Іван Бутока вылучыў жонцы Парасцы Данілавай 1/8 грунту ў Малахавічах, 5 вулляў, чвэрць клячы (1641), іншая маёмасць прыйшлася на дзяцей Станіслава, Давіда, Андрэя і Ганну. Гэта выклікала пратэст мяшчанкі, бо муж пакінуў мала для яе. Але муж адказаў, што вольны распараджацца маёмасцю па сваёй волі. Пасля смерці Івана Параска атрымала за сваю долю 18 коп

[35] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 58 адв. – 60 адв.

[36] Тамсама, арк. 128 адв. – 129.

[37] Тамсама, арк. 211 адв. – 215.

[38] Тамсама, ф. 1761, воп. 1, спр 2, арк 283–283 адв.

[39] Тамсама, арк. 233 адв.

літоўскіх грошаў (1642)[40]. Падчас складання тэстамента лаўніка Аляксандра Карлоўскага выказала незадавальненне жонка Ягнешка Прылуцкая. Ёй прыйшлося чвэрць пустога грунту, пры гэтым землі атрымалі брацтва пры Прачысценскай царкве, дзеці, пляменнікі (1666). Яна прадала маёмасць за 60 злотых старшаму жыдоўскага збору, злотніку Ізааку Фаішу і яго жонцы Фесі Якубаўне ў 1667 г.[41]

За неадпаведныя паводзіны жонку маглі адлучыць ад маёмасці. Фёдар Барсуковіч, бурмістр, першы раз ажаніўся з Аўдоццяй Селявонаўнай. Яна памерла. А перад вайной 1654–1667 гг. ён узяў другі шлюб, які аказаўся няўдалым. У сваім тэстаменце Фёдар абвінавачваў жонку ў п’янстве, марнатраўстве, давядзенні сям’і да галаты. Таму яна была адлучана ад спадчыны. Жонка была пры складанні тэстамента і казала, што калі ажаніліся, то за яе кошт была пабудавана пякарня, якую маскоўскае войска спаліла. Фёдар настойваў, што сам будаваў (1663)[42]. Аргументацыя жанчыны не была прынята пад увагу.

У шляхецкіх дакументах выразна бачна як працавалі інстытуты вена і пасагу. У іх фігуравалі запісы вена на 1/3 маёмасці, вылучэнне пасагу з 1/4 маёмасці. Мяшчанскія дакументы пакідаюць уражанне, што жонцы рабіліся запісы па сітуацыі, па такому ж прынцыпу вылучаўся пасаг дочкам. Адбывалася гэта таму, што Саксонскае Люстра і Вейхбільд не меў такіх дакладных нормаў па сямейным праве як Статуты ВКЛ. Таму мяшчане ў сваіх тэстаментах прызначалі жонкам маёмасць у адпаведнасці са сваім станам. Мужчыны маглі маёмасць як падарыць, так і перадаць у пажыццёвае карыстанне. З пункту гледжання заканадаўства парушэнняў не было. У некаторых тэстаментах адмыслова агаворвалася, што жанчына атрымлівае маёмасць за ўнесены пасаг. Калі не было такой заўвагі ў тэстаменце, то гэта магло азначаць вылучэнне ўдовінай частцы, але можна было разумець і як дараванне маёмасці за добрае стаўленне падчас сумеснага жыцця.

Мяшчанкі мелі права распараджацца маёмасцю. Але ў выпадку складання тэстаментаў гэта адбывалася ў прысутнасці родных. Мяшчанкі па-рознаму размяркоўвалі маёмасць, у залежнасці ад свайго маёмаснага і сацыяльнага статусу. Адзінокія жанчыны маглі прызначыць сваю маёмасць касцёлу. Як вынікае з дакументу Ганна Цыганоўна апошнія перыяд жыцця

---

[40] Тамсама, арк. 180–180 адв., 193–193 адв., 203–203 адв.

[41] Тамсама, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 130–130 адв., 148–149 адв.; Актавая кніга гродзенскага магістрата 1660–1676 гг. // Тамсама, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 149–150.

[42] Імя другой жонкі ў тэстаменце не згадваецца. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 116 адв. – 117 адв., 148 адв. – 149 адв.; ф. 1800, воп. 1, спр 1, арк. 76–77.

знаходзілася пры шпіталю Андрэеўскага касцёла. Адпаведна ўся маёмасць – зямля, грошы, рухомыя рэчы – былі запісаны касцёлу і шпіталю (1638)[43].

Калі ў шлюбе не было дзяцей, то маёмасць размяркоўвалі паміж сваякамі і мужам. Ганна Талочкаўна свой дом на вул. Маставой падзяліла на 3 часткі паміж мужам лаўнікам Фёдарам Юрэвічам і пляменніцамі Люцыяй (жонка Лукаша Скраблякевіча) і Альжбетай (жонка Тамаша Дмухоўскага), дочкамі Барбары Талочкаўны і Войцеха Адамовіча. Фальварак у Манчыне Ганна запісала мужу (1644)[44]. Марына Іванішэвічоўна запісала тэстаментам мужу Савоську Крацэняці палову і трэць валокі ў Грандзічах. З іх ён павінен быў выплаціць пазыкі. Па 10 коп прызначалася пляменніцам з застаўной чвэрці валокі згодна з распараджэннем бацькі Войцеха Іванішэвіча (1664)[45].

Удовы, якія мелі дзяцей, сваю маёмасць прызначалі ім. Ганна Лубянка, удава па Барташу Цвіклічу, запісала дом на вул. Азёрскай сыну ад першага шлюбу Сымону Гемскаму. Але з-за вялікіх запісаў на карысць касцёлаў ён быў вымушаны прадаць дом, каб заплаціць ім грошы (1639)[46]. Ганна Гаўрылавічаўна, удава па Яну Прылуцкаму, падзяліла маёмасць (грунт зямлі, дом, рухомыя рэчы) паміж дзецьмі Ягнешкай, Урушляй, Станіславам і Паўлам (1640)[47]. Згодна з тэстаментам Марыны Сямёнаўны, удавы Ганупа Фандэберка, маёмасць была размеркавана паміж дзецьмі ад першага шлюбу з Паўлам Цвіклічам – радцам Янам, лентвойтам і радцам Станіславам, сендыкам Адамам і Евай. Барташ на той час памёр. Дом на Рынку з рэчамі перайшоў Станіславу, а рухомасць была размеркавана паміж іншымі дзецьмі (1640). Пасля яе смерці быў складзены ўраднікамі інвентар маёмасці (1641). Рэчы былі падзелены паміж спадкаемцамі. Ян засведчыў пра атрыманне сваёй часткі (1642)[48].

Ганна Сямёнаўна пасля вайны 1654–1667 гг. засталася толькі з нерухомасцю. Дачка Палонія ад першага шлюбу з Аляксеем Прыготкам была ўжо замужам на той час за Стэфанам Чарэшкам, таму маёмасць ёй не была вылучана. Зямля была размеркавана паміж другімі двума дзецьмі. Чвэрць валокі ў Гібулічах атрымаў сын Аляксандр, а другая чвэрць там жа была

[43] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 95 адв. – 96.

[44] Тамсама, арк. 276–276 адв.

[45] Тамсама, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 99 адв. – 100.

[46] Тамсама, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 121 адв. – 122 адв.; Natallia Sliž. Testamenty mieszczan grodzieńskich w pierwszej połowie XVII w. // *Kwartalnik Historii Kultury Materialnej*, т. 61, зш. 2 (2013), с. 313–314.

[47] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 129–130 адв.; Natallia Sliž. Testamenty mieszczan grodzieńskich, с. 314.

[48] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 63 адв. – 65, 77–77 адв., 130 адв. – 132; Natallia Sliž. Testamenty mieszczan grodzieńskich, s. 314.

падзелена паміж ім і дачкой ад другога шлюбу Кацярынай Мікуцянкай, якая на той час яшчэ не была замужам (1669)[49].

У выпадку другога шлюбу перавага аддавалася дзецям, а муж мог атрымаць узнагароду за добрае сумеснае жыццё. У тэстаменце Крысціны Пацінкоўны маёмасць была размеркаваны паміж дочкамі ад першага шлюбу з Войцехам Пузнікам – Еве і Марыне. Яны атрымалі ў роўных частках палову валокі, пляц пад гарой і рухомыя рэчы. Другі муж Пётр Марціновіч за добрае стаўленне ў шлюбе атрымаў збожжа, вала, свінню з двума парасятамі, сала, адрыну (1673)[50].

Былі выпадкі большага надзялення маёмасцю кагосьці з дзяцей. Ганна Калаўшчанка, удава сендыка Гераніма Млечкі, пры размеркаванні маёмасці перавагу аддала дачцэ Ядвізе. Яна атрымала паўтары валокі ў Градзічах, дом з пляцам у Гародні і рухомыя рэчы, а сын Францыск толькі валоку ў Манчыне (1664)[51]. Ганна Ёрданаўна, жонка Табіяша Дорбаха, запісала сыну Табіяшу агароды на Падоле, дом на Маставой з броварам. Пры ім заставаліся жыць дачка Зафея і сястра Цэцылія. Абедзве на той час былі ўдовамі (1668)[52].

Часам жанчыны дарылі асобна маёмасць унукам. Агап'я Цімохаўна, удава па Мікалаю Андрэйкі, на пасаг унучкам Кастусі і Марыяне Садоўскім прызначыла пляц на вул. Азёрскай, другі пляц на той вуліцы – дачцэ, іх маці Ганне (1674)[53].

Ад спадчыны аддаляліся дзеці, якія неадпаведна паставіліся да бацькоў. Ядвіга Януцікова апошнія гады жыцця хварэла і яе даглядалі Станіслаў і Юстына. За гэта яны атрымалі па тэстаменту ад маці 1/3 і 1/6 грунту ў Цвіклічах адпаведна. Сын Стэфан яшчэ калі маці была здаровая ўзяў рухомую маёмасць. У перыяд хваробы не даглядаў яе. Таму і застаўся без спадчыны (1667)[54]. Ганна Чэрнікоўна была вымушана адхіліць ад спадчыны сына ад першага шлюбу Сымона Каменскага. Ён нарабіў пазыкі і выехаў з гораду, а маці была вымушана за яго расплачвацца. Пасля смерці другога мужа Фёдара Бабрыкевіча, лаўніка, ёй дапамагаў зяць Павел Ланеўскі. Яму і дачцэ перайшла палова пляца на вул. Бернардынскай. Непаўналетняя дачка Палонія заставалася на частцы вылучанай ёй па бацьку Бабрыкевічу (1674)[55].

---

[49] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 182–182 адв.

[50] Тамсама, арк. 254 адв. – 255.

[51] Тамсама, арк. 100 адв.; Aganeszka Pisanko-Borowik. Testamenty mieszczan grodzieńskich w XVII-XVIII wieku // *Studia Podlaskie*, т. XV, Białystok 2005, с. 158.

[52] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 166–166 адв.; Aganeszka Pisanko-Borowik. Testamenty mieszczan grodzieńskich, с. 166.

[53] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 405.

[54] Тамсама, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 140 адв. – 141.

[55] Тамсама, арк. 278–279.

Часам складанне апошняй волі выклікала канфлікты. Тэстамент жонкі Кацярыны Пельчанкі не задаволіў мужа Аляксандра Карлоўскага (1660). Яна завяшчала дачцэ Зафеі Пельчанцы і яе мужу Міхаілу Багдановічу дом на вул. Віленская. Аднак Кацярына сказала, што гэта яе пляц і на маёмасць мужа яна не прэтэндуе. Гэты аргумент яго задаволіў і ён абяцаў там пабудаваць будынак[56].

Цэцылія Карлоўская першы раз была замужам за Янам Гібулам, другі за Себасцянам Лявонцевічам. Па яе тэстаменту прызначалася тром дзецям ад першага шлюбу пустая валока ў Малахавічах (1670). Мужу за добрае стаўленне, дапамогу ў хваробе пацвярджаўся запіс на дом з пляцам, дарыліся рухомыя рэчы, піўны кацёл. Але на мужа падаў скаргу земянін і генерал гарадзенскі Аляксандр Станіслаў Квач Карлоўскі, брат Цэцыліі, ад сябе і пляменнікаў Стэфана, Міхаіла і Лаўрэна Гібулаў, бо на карысць Лявонцевіча быў запісаны дом, які быў прызначаны дзецям. У дакуменце сцвярджалася, што Лявонцевіч выклікаў да сябе гарадзенскіхураднікаў, калі ўжо сястра была не пры памяці і не магла размаўляць. Перад гэтым Цэцылія распавяла брату, што не збіраецца мужу пакідаць маёмасць, бо ён разам з нейкай дзеўкай выкапаў і забраў яе грошы і срэбра, таксама як і грошы ў каморы пад кублам. Яна збіралася запісаць на храмы 600 злотых. А Лявонцевіч прасіў Аляксандра, каб той угаварыў сястру зменшыць суму. У выніку Цэцылія прызначыла дамініканскаму касцёлу на алтар 100 злотых, Фарнаму – 30, Прачысценскай царкве – 10, убогім шпіталя Св. Духа – 6[57]. Чым скончылася справа невядома, бо ў кнігах няма працягу працэсу.

Мяшчанскія тэстаменты складаліся ў прысутнасці сваякоў. Таму размеркаванне маёмасці жанчыны рабілі пры мужу (калі быў жывы) і дзецях. Аднак асабістае стаўленне ўплывала на вылучэнне маёмасці: падзел мог быць роўны, магла быць аддадзена перавага каму-небудзь ці адлучэнне ад спадчыны. Агульна назіраецца, што для мяшчанак дзеці мелі важнае значэнне. Пра іх клапаціліся пры жыцці і пасля смерці. Не адпаведнае стаўленне дзяцей выклікала рэакцыю, якая адбівалася пры падзеле спадчыны. Жанчыны чакалі ад дзяцей дагляд у старасці, пахаванне і памяць.

На сённяшні дзень захавалася даволі абмежаваная колькасць крыніц па гісторыі гарадзенскіх мяшчанак. Фактычна яны прадстаўляюць сямейную сферу жыцця жанчын. Мала прадстаўлены іх удзел у рамястве і гандлю. На гэта ўплывае адсутнасць архіваў па гарадзенскіх цэхах, малы працэнта захаванасці мытных кніг. Гэтыя дакументы дазваляюць

[56] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 41–41 адв.

[57] Тамсама, арк. 202 адв. – 203 адв.; ф. 1761, воп. 1, спр 2, арк. 209–209 адв.

прасачыць эканамічную дзейнасць мяшчан, а таксама мяшчанак. Малая прэзентатыўнасць крыніц не азначае, што жанчыны не ўдзельнічалі ў эканоміцы горада. Гэта значыць, што гэты аспект іх дзейнасць нельга дакладна прааналізаваць. Асобна можна прасачыць прадстаўніцтва жанчын у гандлю нерухомасцю. Але зноў жа на захаваным матэрыяле з XVII ст. і ўрывачным з XVI ст. Пра непасрэдны ўдзел у сістэме кіравання горада не магло ісці мовы.

Сямейная сфера выразна паказвае дамініруючую ролю мужчыны і другасную жанчыны. У гэтым супадалі і заканадаўства, і практыка права. Жанчына мела права атрымаць маёмасць па спадчыне, перадаць яе спадкаемцам, прадаць, купіць. Але ўсе яе маёмасныя аперацыя здзяйсняліся пад кантролем.



*Ілюстрацыя.* Подпіс мяшчанкі Кацярыны Дахновічаўны, 1655 г.
LVIA, f. 694, ap. 1, b. 4624, l. 5.

*Natallia Sliž*

### Hrodna Petty Bourgeois in Captivity of the Medieval Law: based on the Materials of Agistrate's Books of the Seventeenth Century

*Women's history in Hrodna has not been studied yet. Because of this absence the topic is actual in historiography. There is a limited number of sources that have survived that could be connected to women's history. Practically speaking, they present the family life of women as a dominated role. A role where they are dominated by men in a in a patriarchal society and where they were second. This was confirmed by law and judicial practice. The woman had the right to obtain property by inheritance, transfer it to her heirs, sell, and buy. But all property operations were controlled. Female participation in the craft and trade was not huge. Women could not participate in the management system of the town.*

***Key words:*** women, Hrodna, judicial practice.